# У пошуках навагодняга настрою…

(тэатралізаваная гульневая праграма)

*Сіўцова Алеся Васільеўна,*
*педагог- арганізатар,*
*Бадненка Наталля Паўлаўна,*
*загадчык аддзела мастацкай творчасці,*
*Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі*
*«Цэнтр дзяцей і моладзі Віцебскага раёна»*

**Мэта:** фарміраванне павагі да роднай мовы, нацыянальнай самасвядомасці сродкамі тэатралізаванай гульні.

**Задачы:**

1.Пашырыць уяўленне дзяцей пра культуру і традыцыі беларускага народа;
2.Стварыць для дзяцей атмасферу таямнічасці, загадкавасці, чарадзейнасці;
3. Развіць камунікатыўныя якасці дзяцей.

**Мэтавая аўдыторыя:** дзеці малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

**Дзеючыя асобы:** Дзед Мароз, Снягурка, , дзяўчынкі-сняжынкі.

**Рэквізіт:** каробка-падарунак, бутафорскія снегавік, сняжынкі, навагоднія цацкі і атрыбуты бытавога жыцця.

**Абсталяванне:** камп'ютар, сцэнічнае святло.

*( Гучыць навагодняя музыка. На экране - вёскі Віцебскага раёну.*
*Харэаграфічны малюнак, у фінале якога выходзяць Дзед Мароз і Снягурка)*

**Дзед Мароз:**
З Новым годам, з Новым годам!
З новай песняй, з новай казкай!
Зачаруем мімаходам
Навагодняй думкай-краскай!

**Снягурка**:
З Новым годам, што крыніцай
У Новым прыйдзе да нас годзе,
Беларуская зямліца!
Беларускі наш народзе!

*(На экране - карцінка ёлкі дагары нагамі,пераблытаных падарункаў, гірлянд, разламаны снегавік.)*

**Дзед Мароз:** Добры дзень, паважаныя сябры!

**Снягурка**: Вітаем вас у гэтай святочнай зале, любыя гледачы!

**Дзед Мароз:** Ішлі да вас праз лясы ды дубравы, праз вёсачкі, аграгарадкі, ды гарады, каб павіншаваць вас з Новым годам.

**Снягурка**: У год культуры збіралі для вас, дараженькія, падарункі і пажаданні, але ж злыдні ізноў усё пабераблыталі: падарункі, навагоднія агеньчыкі,карагоды падмянілі на прыпеўкі, нават навагодні настрой зблыталі.Вось,дзядуля, паглядзі толькі, што здарылася з нашым снегавіком. Усё пераблыталася.

(Паказвае Дзеду Марозу два вялікія камы ад снегавіка, на якіх прылеплена шмат каляровых сняжынак- усмешак.)

**Дзед Мароз:** Так, добры настрой разам з дрэнным знаходіцца, вось чаму ўсмешак у гледачоў зусім мала.

**Снягурка:** Што ж будзем рабіць?

**Дзед Мароз:** Як што?! Вядома ж, ратаваць свята. А ў гэтым нам дапамогуць самі гледачы. Гэтая палова зала будзе мне дапамагаць, а гэтая - Снягурке. Вы павінны гэтыя камякі перадаваць з рада ў рад і здымаць для сябе гэтыя сняжынкі навагодняга настрою.

**Снягурка**: Але ж рабіць гэта мы будзем пад музыку. Як толькі яна спыніцца, той, у каго ў руках будзе камяк, павінен здымае адну сняжынку. Як толькі музыка працягнецца, камяк трэба перадаваць далей.Памочнікі, даражэнькія, пакажыце, як гэта трэба рабіць. *(Памочнікі-сняжынкі з харэаграфічнага калектыву паказваюць - кідаюць адна адной, як толькі музыка спыняецца, здымаюць адну сняжынка з паперы)*.Палова залы, якая хутчэй зніме ўсе сняжынкі, будзе пераможцам. Зразумела? Тады пачынаем.

(*На кожным камяку - па тры яркія сняжынкі, а астатнія - сінія і белыя. Памочнікі дапамагаюць праводзіць гульню са снежнымі камякамі.Снягурка ў гэты час спускаецца да гледачоў з мехам, у якім - падарункі і цукеркі.)*

**Снягурка**: Дзядуля, паглядзі, як спрытна яны справіліся.Ніводны дрэнны настрой не застаўся на камяку. Выратавалі нашага снегавіка.

*(Памочнікі ставяць камы адзін на аднога, каб атрымаўся снегавік.На экране - снегавік з усмешкай)*

**Дзед Мароз:** Вось дык малайцы! Абавязкова трэба пачаставаць усіх цукеркамі.

*(Снягурка частуе дзяцей цукеркамі.Потым заўважае, што ёсць і не сапраўдныя цукеркі.)*

**Снягурка**: Дзядуля, толькі глянь: нячысцікі і цукеркі нам з табою падмянілі *( Залазіць к Дзеду ў мех, дастае рваны бот)* і астатнія падарункі.Што ж рабіць?

**Дзед Мароз:** Як што? Клікай да мяне тых, каму застаўся самы сонечны настрой.

**Снягурка:** Паважаныя гледачы, паглядзіце, калі ласка, каму дасталася аранжавая сняжыначка настрою. Падымайцеся да нас!

*(Усе з аранжавымі сняжынкамі запрашаюцца на сцэну)*

**Снягурка:** Спачатку мы з вамі пазнаёмімся. Як цябе завуць? *(З усімі знаёміцца)*. Дапамажыце, калі ласка, дзядулю перабраць падарункі. *(Выносяцца два мяшкі. Адзін напоўнены падарункамі, агеньчыкамі, лыжамі, сандалямі, рукзакамі, барабанам, старой сукенкай, венікам, шуфлікам і г.д., у другі яны будуць складаць толькі навагодія падарункі і садавіну)*. Вы павінны скласці ў адзін мех падарункі, а ў другі – ўсё, што нам не патрэбна на новы год.(*Снягурка звяртаецца і да удзельнікаў, і да гледачоў)*. Вось паглядзіце: гэтыя агеньчыкі нам патрэбны? *(Дзеці адказваюць.)* Сапраўды. Таму мы кладзем іх у гэты мех. А гэты бот? *(Дзеці адказваюць.)* Канечне, не патрэбен, таму мы яго пакладзём у гэты мех. Зразумела заданне?! Тады пачанайце!

*(Снягурка уважліва сочыць за удзельнікамі, дапамагае ім, або перашкаджае, каб Дзед Мароз паспеў задаць свае пытанні, цягне час.)*

**Дзед Мароз:**Пакуль мае памочнікі працуюць, вы, мае даражэнькія, дапаможаце мне вырашыць, па якім маршруце трэба рухацца далей па нашай краіне,каб трапіць у Белавежскую пушчу. Нячысцікі і тут нашкодзілі - пераблыталі карткі з фотаздымкамі, і я не ведаю, дзе які горад. Па дарозе я буду вам паказваць нашу краіну, а вы павінны па выяве архітэктурных помнікаў даведацца, што гэта за горад. Зразумела?! Тады паехалі…

*(На экране - фотаздымкі навагодніх гарадоў Беларусі. Гледачы павінны гучна адказаць, што гэта за мясціны: Мінск, Гродна, Віцебск, Магілёў, Гомель, Брэст і Белавежская пушча.)*

**Дзед Мароз**: Якія малайцы! Як вы мне дапамаглі! Снягурка, ці справіліся твае памочнікі? Давай паглядзім.

*(Дзед Мароз уважліва правярае мех з падарункамі, паказваючы гледачам. На экране - ёлка ўжо не толькі з агеньчыкамі, але і з падарункамі)*

**Дзед Мароз:** Дзякуй вялікі, мае даражэнькія, за ваш навагодні настрой, без вас мы не справіліся б. *(Частуе цукеркамі).* Займайце свае месцы ў зале.Вось ўсё і стала на свае месцы.

*( На экране - галоўная ёлка страны)*

**Снягурка**: Дзядуля, а як гледачы справіліся с тваім заданнем?

**Дзед Мароз:** Добра. Вельмі разумныя дзеці, ведаюць сваю краіну. Можна ўжо рыхтавацца да навагодніх канікул і сустрэчы гасцей са усяго света у нашай рэзідэнцыі.

**Снягурка:** Пачакай, дзядуля. Не спяшайся. Каб нам не змерзнуць з дзецьмі ў Белавежскай пушчы, трэба крыху сагрэцца і праверыць, наколькі добра яны падрыхтаваліся да зімы і Новага года.

**Дзед Мароз:** Сапраўды.

**Снягурка**: Тады, паважаныя гледачы, падымайцеся са сваіх месцаў і ўважліва слухайце. Калі мы з Дзедам Марозам правільна гаворым, што мы робім зімой, тады ўсе гучна пляскаем у далоні. Вось так. *(Паказвае.)*

**Дзед Мароз:** А, калі мы памыляемся, то тупаем нагамі. Вось так. *(Паказвае.)*

**Снягурка**: Зразумела? Тады слухайце ўважліва.

*(Гучыць песня- віктарына, дзе сваімі дзеяннямі гледачы адказваюць на пытанні: верна, ці не на пытанні Дзеда Мароза і Снягуркі, харэаграфічны калектыў дапамагае у зале.)*

**Дзед Мароз:** З сябрамі ў снежкі вы гуляеце? *( Пляскае.)*

**Снягурка:** А зімой грыбы збіраеце?! *(Тупае.)*

**Дзед Мароз:** На санках вы катаецеся? *( Пляскае.)*

**Снягурка:** І ў рэчцы ўсё купаецеся? *(Тупае.)*

**Дзед Мароз:** Лыжы будзем даставаць? *( Пляскае.)*

**Снягурка:** А, караблікі пускаць? *(Тупае.)*

**Дзед Мароз:** Футры трэба апранаць? *( Пляскае.)*

**Снягурка:** Ці будзем з вамі загараць? *(Тупае.)*

**Дзед Мароз:** Ёлку будзем прыбіраць? *( Пляскае.)*

**Снягурка**: А ў лесе ягады шукаць? *(Тупае.)*

**Дзед Мароз:** Зіма - добрая пара? *( Пляскае.)*

**С-ка:** Мы адкажам разам: " Так" *( Пляскае.)*

**Дзед Мароз:** Вось якія вы уважлівыя. Малайцы!

**Снягурка:** І навагоднім падарункам за ваш святочны настрой будзе наша прыдзвінская песня.

**Дзед Мароз:** Унучка, толькі спярша трэба паклікаць нашых сняжынак.

**Снягурка:** Сняжыначкі-пушыначкі,
Ляціце матылькамі,
Над хмызамі над шызымі
Дыміціся дымкамі.

**Дзед Мароз:** Маленькія, міленькія,
Дзіцяткі-птушаняткі,
Ляціце вы, скачыце вы
У светленькія хаткі!

*( З розных бакоў выбягаюць дзеці з харэаграфічнага калектыву ў адзенні сняжынах.)*

**Снягурка:** Дзядуля, усё ж самае чароўнае свята - гэта Новы год. Так прыемна быць чараўніком.

**Дзед Мароз:** Даражэнькая мая, кожны жыхар у нашай краіне добры, сумленны, працавіты. І сваімі добрымі справамі зьяўляецца Дзедам Марозам не толькі ў Новы год.

*(Гучыць фінальная песня, пад час песні Дзед Мароз выстрэльвае феерверк.)*

**Дзед Мароз:**
Белы снег над зямлёю кружыцца,
Замятае сцяжынкі да пад'ездаў.
Сэрца б'ецца у грудзях, нібы птушка.
І выносіць мяне, як песня з дзяцінства.
**Снягурка:**
Новы год заззяў за гарамі,
З першых елак пабеглі хвілінкі,
Мітусня завалодала розумам
У пераходах метро і набітых маршрутках.
**Прыпеў (разам):**
Новы год абавязкова настанне,
Дзед мароз запражэ свае сані.
Шчасце будзе таму, хто кахае.
Дзед Марозы - гэта мы самі.
Новы год абавязкова настане,
Дзед Мароз запражэ свае сані.
Шчасце будзе таму, хто кахае.
Дзеды Марозы - гэта мы самі.
**Дзед Мароз**
Новы год пачакае і прыйдзе,
Раздадуцца ўдары курантаў.
Усе вакол загадаюць жаданне
І за кожным акном запаляцца гірлянды.
**Снягурка:**
“Аліўе” і бенгальскія свечкі,
Трэск петард, звон куфляў з шампанскім.
І няхай увесь смутак вылечаць
Блакітны агеньчык і вясёлыя танцы.
**Прыпеў (разам):**
**Дзед Мароз:** З надыходзячым новым годам!
**Снягурка:** Здароўʼя!
**Дзед Мароз:**Шчасця!
**Снягурка**: Кахання!
**Дзед Мароз:** Дабрабыту!
**Снягурка**: Усяго найлепшага!
**Дзед Мароз:** Няхай здзейсняюцца ўсе вашы мары!
**Дзед Мароз і Снягурка** (разам): Да новых сустрэч!